тировщиков сложных систем. Сегодня можно с достаточной определенностью утверждать, что возникающие проблемы и отставание во многих областях связаны не столько с недостатком ресурсов, сколько с неспособностью и неумением ими распорядиться.

Таким образом, анализ интегративных тенденций в современном социально-гуманитарном знании представляет собой сложную комплексную проблему, требующую для своего решения методологически содержательного подхода.

**В.П.Пракапцова,** *прафесар*

## МАСТАЦКАЯ АДУКАЦЫЯ ЯК ПРАЦЭС ВЫХАВАННЯ ТВОРЧАЙ АСОБЫ

Мастацкая адукацыя займае асобае месца ў сацыякультурнай прасторы. Яна фарміруе і ўдасканальвае творча-інтэлектуальны і прафесійна-кваліфікацыйны патэнцыял асобы, выяўляе і развівае мастацкія здольнасці і інтарэсы індывідуальнасці. Мастацка-адукацыйны працэс базіруецца на ўзаемадзеянні дзвюх аб'ектыўных рэалій – дзейнасці майстра-выкладчыка, які валодае багатым практычным вопытам і грунтоўнымі навукова-тэарэтычнымі ведамі, і фарміраванні непаўторнай, індывідуальнай, таленавітай творчай асобы–вучня. Мастацкая адукацыя ў сацыякультурным кантэксце заўсёды функцыянальна накіравана і ўзаемазвязана з рознымі мастацкімі плынямі, традыцыямі і актуальнымі кірункамі культуры. Не выпадкова да працэсу мастацкага навучання сваіх маладых калег звярталася большасць значных творцаў розных эпох, бо жаданне перадаць веды, навучыць мастацкім прынцыпам, сфарміраваць кола аднадумцаў і паслядоўнікаў заўсёды было ўласціваe вялікім майстрам. Супольнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

майстра і вучня ў значнай ступені вызначала творчыя здабыткі мастацтва.

Мастакі, музыканты, дзеячы тэатра працуюць у розных відах мастацтва, і адпаведна разнавідавая мастацкая адукацыя адрозніваецца па сваіх творчых і педагагічных прынцыпах. Мастацкія таленты непараўнальныя. Не існуе пэўных заканамернасцей, якія б дазволілі дакладна вызначыць творчы патэнцыял мастака. Але талент, адоранасць мастака заўважаюць, цэняць і сучаснікі, і нашчадкі. Мастацкая адукацыя стварае больш значныя ўмовы для найбольш поўнага раскрыцця таленту.

Пытанне аб сутнасці мастацкай адукацыі – гэта пытанне аб сэнсе і сродках мастацкага развіцця асобы ў пэўных сацыякультурных умовах, аб тым, у імя чаго рэальна, на практыцы чалавек імкнецца да абнаўлення мастацтва і яго дэмакратызацыі. Пытанне аб сутнасці мастацкай адукацыі – гэта пытанне аб мэтазгоднасці і найбольш дасканалых метадах фарміравання творчай індывідуальнасці.

Функцыянаванне мастацкай адукацыі не з'яўляецца самамэтай. Асноўная яе мэта – падрыхтоўка творчай індывідуальнасці. Мастацкая адукацыя фарміруе творчыя здольнасці і садзейнічае сацыякультурнаму развіццю грамадства.

Кожная эпоха вызначае новыя праблемы, якія раней не былі вядомыя мастацкай адукацыі і якія адлюстроўвалі новыя патрабаванні мастацкага і сацыяльнага жыцця. Крыніцай гэтых навацый з'ўлялася багацце творчай прыроды чалавека, яго духоўнага патэнцыялу. Такім чынам, сутнасныя магчымасці мастацкай адукацыі вызначаюцца ўзроўнем сацыяльнага развіцця на пэўным гістарычным этапе, ступенню развіцця мастацтваў (мастацкай культуры) і ўзроўнем прафесійнай методыкі выхавання творчай індывідуальнасці.

Асноўная ўнутрысістэмная функцыя мастацкай адукацыі – падрыхтоўка творчай індывідуальнасці. Асноватворнымі ў выхаванні творчай індывідуальнасці з'яўляюцца два кірункі, дзве спецыфічныя функцыі – фарміраванне асобы творцы-аўтара і

фарміраванне асобы творцы-выканаўцы. Выкананне як спецыфічная форма дзейнасці існуе толькі ў межах двух відаў мастацтва – музычнага і тэатральнага.

У межах сістэмы мастацкай адукацыі фарміруюцца асноўныя неабходныя прафесійныя навыкі, якія папаўняюцца надалей працэсам самаадукацыі, самаўдасканалення, у выніку чаго фарміруеццца майстар найвышэйшага ўзроўню.

Сапраўдны творца, якіх бы вышынь ён ні дасягнуў у сваёй дзейнасці, вучыцца пастаянна, на працягу ўсяго жыцця. І ў гэтым сэнсе праца з вучнем (асабліва таленавітым, перспектыўным) ёсць таксама працэс далейшага адукацыйнага развіцця майстра-педагога, які шукае новыя сродкі і прыёмы для выхавання індывідуальнасці мастака. Мастацкая адукацыя як прынцып, сродак выхавання творцы двухадзіная, біфункцыянальная. З аднаго боку, яна фарміруе мастацкія ўменні, навыкі, ці інакш можна сказаць, дае мастацка-рамесную аснову прафесіі. З другога боку, стымулюе, ініцыіруе далейшае майстэрскае карыстанне гэтымі ўменнямі і навыкамі.

Працэс фарміравання сістэмы мастацкай адукацыі вызначаецца змяненнямі, якія пэўным чынам накіраваны на якасныя пераўтварэнні формаў, прынцыпаў і метадаў навучання. Але ў цэлым працэс развіцця мастацкай адукацыі вызначаецца вырашэннем адзінай мэты-задачы – выхаванне і адукацыя творчай індывідуальнасці, развіццё яе прафесійных уменняў і навыкаў. Бясспрэчна, кожны від мастацтва мае свае сродкі і прыватныя методыкі адукацыі, з дапамогай якіх вучаць, як карыстацца прафесійным інструментарыем мастака, музыканта, акцёра.

Цеснае ўзаемапранікненне, падчас нават зліццё шляхоў развіцця мастацтва і мастацкай адукацыі, тлумачыцца ў значнай ступені агульнымі асаблівасцямі мастацка-творчай і мастацка-адукацыйнай дзейнасці. Пры гэтым нельга ігнараваць прынцыповыя адрозненні мастака-творцы і мастака-педагога, бо для першага галоўным з'яўляецца мысленне вобразнае, а для другога – навукова-вобразнае. Мастак-творца стварае ў вобразах свае,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суб'ектыўныя карціны свету. Мастак-педагог перадае вучням больш аб'ектыўныя навукова-творчыя навыкі. Метад мастака-творцы больш індуктыўны, а мастака-педагога больш дэдуктыўны. Дзейнасць мастака-творцы грунтуецца ў большай ступені на мастацкасці, а дзейнасць мастака-педагога на дыдактычнасці. Разам з тым агульнавядома, што лепшым настаўнікам у галіне мастацтва з'яўляецца сам выдатны творца. Яго вучні з цягам часу таксама становяцца творцамі.

Фарміраванне творчай асобы адбываецца падчас вучобы ў навучальных установах розных узроўняў – пачатковага, сярэдняга спецыяльнага і вышэйшага.

Так, мастацкая адукацыя ў межах пачатковага ўзроўню мела некалькі разнавіднасцей: дамашняе навучанне, студыі, курсы, школы. Сярэдняя спецыяльная адукацыя – вузкапрофільныя вучылішчы (як, напрыклад, вучылішча арганістаў у Мінску ў XIX ст.), тэхнікумы, вучылішчы па відах мастацтва, каледжы. Вышэйшая адукацыя – інстытуты, кансерваторыі, акадэміі, універсітэты. На працягу ўсёй гісторыі мастацкай адукацыі яе ўзроўневыя разнавіднасці мелі пэўную агульнапрынятую ўзроставую дыферэнцыяцыю: у пачатковых навучальных установах вучыліся дзеці, у сярэдніх спецыяльных – падлеткі, у вышэйшых – моладзь. Аднак да поўнага станаўлення сістэмы мастацкай адукацыі ў сярэдзіне XX ст. былі і выключэнні, калі ў перыяды пошукаў дакладных мастацкаадукацыйных формаў і імкнення паскоранага задавальнення сацыякультурных патрэбнасцей дапускалася навучанне розных узроставых груп у навучальных установах розных узроўняў. Яскравым прыкладам таму служаць 20-я гг. XX ст., калі ў народных кансерваторыях былі групы як для дарослых, так і для дзяцей, а ў музычных школах маглі вучыцца не толькі дзеці, але і дарослыя. Аналагічныя прыклады былі амаль у кожным з мінулых стагоддзяў.

Разглядаючы шлях мастацкай адукацыі як бесперапынны працэс выхавання творчай асобы, працэс станаўлення інтэлектуальнага патэнцыялу чалавека ў мастацкім асяроддзі, можна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцвярджаць, што мастацкая адукацыя ўбірае ў сябе паслядоўную распрацоўку тэндэнцый, формаў, метадаў, прынцыпаў, стылю суадносін майстра і вучня ў адлюстраванні запатрабаванняў часу.

**И.Л.Прокопчик-Гайко,** *доцент*

## АКТУАЛЬНЫЕ ВОПРОСЫ ФОРМИРОВАНИЯ МИРОВОЗЗРЕНИЯ В ВЫСШЕЙ ШКОЛЕ

Мировоззрение представляет собой систему взглядов на объективный мир и место в нем самого себя. Оно является ядром общественного и индивидуального сознания, определяет социально-политическую, религиозную, нравственную, эстетическую, научно-теоретическую ориентацию человека.

Традиционно в философии выделяются три основных типа мировоззрения: житейское (обыденное), религиозное, философское (научное).

Неоспоримым является тот факт, что сформированное научное мировоззрение современного преподавателя высшей школы – это теоретико-познавательная основа воспитательной работы с новым поколением специалистов. Прочные мировоззренческие позиции человека, занимающегося воспитанием, определяют не только его собственные взгляды на происходящие события, но и обеспечивают мировоззренческий статус общества в будущем.

За последнее десятилетие в Беларуси широко развернулись многочисленные религиозные направления, которые пропагандируют существование высших сил, якобы способных помочь человеку решить его проблемы. Среди них не только христианство, признаваемое сегодня как социально приемлемое, но и шаманизм, учение Кришны, религиозное направление адвентистов седьмого дня, учение о высшей космической энергии, с помощью

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ